■ Сітуацыя

# АЗДАРАЎЛЕННЕ АБО БАНКРУЦТВА?

## Што чакае Салігорскі завод тэхналагічнага абсталявання

**Старшыня Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Міхаіл Мясніковіч з рабочай паездкай наведаў Салігорскі раён. На Салігорскім заводзе тэхналагічнага абсталявання спікер верхняй палаты парламента сустрэўся з працоўным калектывам. Прадпрыемства заснавана ў 1987 годзе, у 1996-м акцыянавана, спецыялізуецца на вытворчасці і рамонце абсталявання для горназдабыўнай і хімічнай галіны.**

Апошнія пяць гадоў завод накоплівае праблемы. Вялікая крэдыторская запазычанасць, у тым ліку пратэрмінаваная, не дазваляе разлічваць на атрыманне дадатковых сродкаў для папаўнення абаротнага капіталу і вырашаць пытанні загрузкі вытворчых магутнасцяў. Становішча абцяжарваецца яшчэ і тым, што тут не думалі аб перспектыве развіцця і ў асноўным выпускалі традыцыйнае горна-шахтнае абсталяванне. Прычым яно не можа канкурыраваць на рынку ні па якасці, ні па цане.

Асноўны заказчык прадпрыемства — Беларуськалій.

— У сярэдзіне мінулага года завод не вытрымаў тэрмінаў выканання дагавораў са сваім галоўным спажыўцом. У выніку разліковы рахунак апусцеў. Гэта пацягнула за сабой запазычанасць па заработнай плаце, крэдыторам, пастаўшчыкам электраэнергіі, у бюджэт. Цяпер прадпрыемства працуе ў асноўным на давальніцкай сыравіне, — адзначыў **дырэктар Юрый ТРАЯН.**

— Такая сітуацыя працягваецца каля года, — канстатавала **выконваючая абавязкі старшыні Салігорскага райвыканкама Людміла ЦЫБУЛЁНАК.** — Неаднаразова распрацоўваліся розныя варыянты па выхадзе з крызісу, былі прапановы і з боку акцыянераў, яны запрабавалі прадаць каштоўныя паперы праблемнага актыву. Але нічога з гэтага не атрымалася. Сёлета змянілася і кіраўніцтва завода. Яго намаганнямі ўдалося захаваць касцяк калектыву. Цяпер тут працуе 160 чалавек. Але зноў жа многія з іх цалкам не загружаны і, канешне, не маюць дастойных заробкаў. Так працягвацца далей не можа. Калі акцыянеры не прыйдуць да агульнай згоды, не будуць уліваць капітал у вытворчасць, то, магчыма, варта разгледзець пытанне аб банкруцтве завода з далейшым працаўладкаваннем людзей на прадпрыемствах Салігорскага раёна.

Падтрымаў Людмілу Цыбулёнак **намеснік старшыні Мінаблвыканкама Алег ПЛАЎСКІ:** «Сітуацыя, што склалася на прадпрыемстве, — вынік мэтанакіраванай дзейнасці акцыянераў. Фактычна на працягу ўсяго перыяду не вялося абнаўленне абсталявання, мадэрнізацыі, дыверсіфікацыі вытворчасці. Мы абмяркоўвалі пытанне, каб перадаваць акцыі ў аператыўнае кіраванне або часткова ўзяць кантрольны пакет у камунальную ўласнасць. З тым, каб усе наступныя прыбыткі ад выканання заказаў укладваліся ў развіццё прадпрыемства, мадэрнізацыю».

Выслухаўшы меркаванні ўсіх зацікаўленых, Міхаіл Мясніковіч прапанаваў вывучыць магчымасць дасудовага аздараўлення прадпрыемства шляхам санацыі або частковай санацыі: «Тут сфарміраваны партфель заказаў на другое паўгоддзе. Магчыма, гэта шанц, каб аздаравіць эканоміку. Дзяржава не адмахваецца ад праблем прадпрыемства, але ў першую чаргу трэба вельмі сур'ёзна працаваць з акцыянерамі. У гэтай сітуацыі трэба дзейнічаць рашуча, і нават забраць акцыі праз суд. Мы разгледзім пытанне і з прававога пункту гледжання. І калі акцыянеры давялі прадпрыемства да ручкі, а гэта менавіта так, то трэба, каб яны адказвалі па законе. Гэта будзе ўрок і для іншых акцыянераў краіны. Уласнікі павінны адчуваць адказнасць за лёс прадпрыемства, калектыву. Усё добра — яны кладуць грошы ў сваю асабістую кішэню, дрэнна — дзяржава падстаўляй плячо. У тым ліку і акцыянеры таварыства павінны сабрацца разам і вырашыць, як працаваць далей, а не дзяліць дывідэнды».

Гранічна шчырым быў спікер верхняй палаты парламента і з калектывам, залатых гор не абяцаў: «Скажу адкрыта, вам ніхто не дасць крэдыт, ні адзін банк. Таму што вы яго не можаце выкарыстаць па прызначэнні. Але мы разумеем, што ў вас ёсць сем'і, дзеці, якіх трэба ўтрымліваць. Як і тое, што трэба дапамагчы людзям, якія не па сваёй віне аказаліся ў складанай сітуацыі. Разам з тым і вам трэба было праяўляць большую актыўнасць, уздымаць праблемы на сходах, перад кіраўніцтвам прадпрыемства. Магчыма, тады такой цяжкай сітуацыі можна было б пазбегнуць. Будзем думаць, як выходзіць са становішча. Мясцовая ўлада, урад не пакінуць вас сам-насам з праблемамі. На жаль, большага не магу абяцаць. Сёння ў прадпрыемства няма перадумоў для перспектывы. Мы разгледзім прапановы ўсіх зацікаўленых бакоў, як падтрымаць завод. Але гэта будзе тычыцца радавых работнікаў, працоўнага калектыву».

Сітуацыю ў ЗАТ «Салігорскі завод тэхналагічнага абсталявання» мясцовыя ўлады трымаюць на кантролі. Аб усіх прынятых рашэннях будзе інфармавацца працоўны калектыў.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ**




# РАЎНАВАГА ЎСІХ ВЕРАВЫЗНАННЯЎ

**Многія канфлікты і нават войны ўзнікаюць на рэлігійнай ці нацыянальнай глебе. Таму так важна ўтрымліваць сітуацыю стабільнасці, якая ёсць у этнаканфесіянальнай сферы Беларусі. Пра гэта падчас калегіі апарату ўпаўнаважанага па справах рэлігій і нацыянальнасцяў нагадаў яго кіраўнік Леанід ГУЛЯКА.**



Удзельнікі калегіі падчас наведвання кафедральнага сабора Святых Кірылы і Лаўрэнція Тураўскіх.

— За 10 гадоў на гэтай пасадзе я нідзе ні разу не чуў, каб людзі казалі пра тое, што ім некамфортна жыць з-за наяўнасці нейкай іншай рэлігіі побач. Але ж такая сітуацыя — штодзённая карпатлівая праца на ўсіх узроўнях улады ў рэспубліцы і вынік дзяржаўнай палітыкі, якая праводзіцца ў нашай краіне. У нас рэальна працуюць усе пастулаты, прапісаныя ў Канстытуцыі і іншых заканадаўчых актах адносна рэлігіі і канфесіянальных пытанняў. Дарэчы, наша краіна — адзіная ў Еўропе, дзе дзяржава выдзяляе бясплатна зямлю пад будаўніцтва культавых будынкаў любой канфесіі. Бо, калі дзяржава будзе браць грошы за выдзяленне зямлі, яна мусіць збіраць іх з тых жа грамадзян.

Між тым сёння на тэрыторыі Беларусі пражываюць прадстаўнікі 141 нацыянальнасці, 26 канфесій, з якіх 16 прадстаўлена на Гомельшчыне. У краіне 84,5% ад колькасці вернікаў адносяць сябе да праваслаўных, 12% — католікі і 3% прыпадаюць на астатнія 24 канфесіі.

— Дык вось, важна, каб яны ўсе, негледзячы на тое, каго больш, каго менш, адчувалі сябе ў прававым полі аднолькава, — падкрэслівае ўпаўнаважаны па справах рэлігій і нацыянальнасцяў Леанід Гуляка. — І гэта дзяржаўная палітыка. Важны іх міжканфесіянальны дыялог і іх міжканфесіянальныя кантакты.

Актуальным пытанням этнаканфесіянальнай сферы ў Гомельскай вобласці і выкананню статутнай дзейнасці рэлігійнымі арганізацыямі на Гомельшчыне было прысвечана выступленне **начальніка галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Гомельскага аблвыканкама Ірыны ДАЎГАЛА.** Яна падкрэсліла, што сёння святары ўсіх канфесій маюць дазвол апарату ўпаўнаважанага па справах рэлігій і нацыянальнасцяў на правядзенне рэлігійнай дзейнасці:

— У нас былі пэўныя праблемы, але цяпер магу дакладна сказаць, што прадстаўнікі ўсіх канфесій маюць дазвол. У нас кожны мае роўныя магчымасці прадстаўляць сваё веравызнанне. Самае галоўнае, каб усе выконвалі заканадаўства краіны.

Чатырнаццаць гадоў у эфіры тэлерадыёкампаніі «Гомель» выходзіць праваслаўная духоўна-асветніцкая праграма «Ключ разумення». Яе нязменны вядучы, **старшы выкладчык Гомельскага дзяржаўнага ўніверсітэта транспарту Аляксандр ЯЛОПАЎ** быў запрошаны расказаць пра радыёперадачу, якую з цікавасцю слухаюць не толькі вернікі, але і атэісты, і прадстаўнікі іншых канфесій:

— На нашу праграму разам са святарамі прыходзяць урачы і псіхолагі, настаўнікі, выкладчыкі ВНУ, — расказаў Аляксандр Ялопаў. — Мы імкнёмся знайсці такую мову, паставіць такія пытанні, развіць такія тэмы, каб гэта было цікава ўсім. Многія кажуць, што праграма дапамагае ім лепш разумеюць тое, чым жылі, у што верылі іх продкі. Многія мелі магчымасць пазбавіцца ад забабонаў адносна праваслаўнай царквы. Праваслаўныя, якія слухаюць нашу праграму, таксама вучацца. Напрыклад, старажытныя каштоўнасці сваёй веры перакладаць на мову сучаснай культуры.

Удзельнікі выязной калегіі апарату ўпаўнаважанага па справах рэлігій і нацыянальнасцяў наведалі нядаўна пабудаваны кафедральны сабор Святых Кірылы і Лаўрэнція Тураўскіх і азнаёміліся з экспазіцыяй Тураўскага краязнаўчага музея «Старажытны Тураў». Упаўнаважаны па справах рэлігій і нацыянальнасцяў Леанід Гуляка ўзнагародзіў шэраг адказных асоб граматамі за значны асабісты ўклад у справу падтрымкі і развіцця этнаканфесіянальнай сферы.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**
*iost@zviazda.by*
**Фота аўтара.**

■ Знешняя стратэгія

# У ПОШУКАХ РЭЦЭПТА ПАВЫШЭННЯ ЭКСПАРТУ

**Беларускія дыпламаты прыбылі ў Мінск для ўдзелу ў штогадовым семінары кіраўнікоў дыпламатычных прадстаўніцтваў і консульскіх устаноў Беларусі. Семінар праходзіць з 11 па 15 ліпеня. Міністр замежных спраў Уладзімір МАКЕЙ падчас адкрыцця мерапрыемства зазначыў, што ў сучасных умовах пытанні знешнеэканамічнай дзейнасці стануць прыярытэтнымі.**

Плануецца, што цэнтральным элементам праграмы семінара стане рабочая нарада з кіраўніцтвам урада, падчас якой будуць абмяркоўвацца праблемы, што ўзнікаюць пры экспарце айчынных тавараў. Асобная ўвага на семінары таксама будзе надавацца і прыцягненню інвестыцый, павышэнню іх якасці і эфектыўнасці асваення сродкаў. Прадугледжаны і дзелавыя сустрэчы з кіраўнікамі галіновых міністэрстваў і ведамстваў.

Акрамя таго, Уладзімір Макей падчас прамовы звярнуў увагу на тое, што мінулы год для МЗС быў адначасова напружаным і выніковым. Ён адзначыў, што ўдалося рэалізаваць задачы, пастаўленыя кіраўніком дзяржавы ў знешняй палітыцы. Аднак у знешнеэканамічнай дзейнасці сітуацыя склалася менш пазітыўная, хоць і ў гэтым напрамку назіраюцца некаторыя перспектывы. Міністр замежных спраў падкрэсліў, што прыняты на пятым Усебеларускім народным сходзе пяцігадовы план сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны павінен стаць пераломным для пераадолення негатыўных тэндэнцый. Пры гэтым МЗС і дыппрадстаўніцтвам адводзіцца ключавая роля ў выпрацоўцы і рэалізацыі адпаведных мер.

**Ілья КРЫЖЭВІЧ,** *Kryzhevich@zviazda.by*

**Сакратарыят Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь выказвае глыбокія спачуванні саветніку-кансультанту арганізацыйнага ўпраўлення Сакратарыята Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь Маскалёвай Святлане Віктараўне ў сувязі з напаткаўшым яе вялікім горам — смерцю БАЦЬКІ.**

**Сакратарыят Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь выказвае глыбокія спачуванні вядучаму спецыялісту аддзела па забеспячэнні работы Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па эканоміцы, бюджэце і фінансах Генрасавай Валянціне Сяргееўне ў сувязі з напаткаўшым яе вялікім горам — смерцю МАЦІ.**

***УВАЖАЕМЫЕ АКЦИОНЕРЫ***
***ОАО «Управляющая компания холдинга «Лидсельмаш»***

**22 июля 2016 года состоится внеочередное общее собрание акционеров**

**ОАО «Управляющая компания холдинга «Лидсельмаш»,**

**расположенного по адресу: г. Лида, ул. Советская, 70 в 12.00 (конференц-зал)**
(собрание проводится в очной форме)

**Повестка дня собрания:**

1. О сделке Общества, в совершении которой имеется заинтересованность его аффилированных лиц.

УНП 500021638 **Наблюдательный совет ОАО «Управляющая компания холдинга «Лидсельмаш»**